**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦЬВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ

Ходзін С.М.
__________________ ____________________

Рэгістрацыйны № УД– _____ /уч.

# ГІСТОРЫЯ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках)

напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (гісторыя і музеялогія)
напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (мастацтвазнаўства і музеялогія)
напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарта «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) ОСВО 1-23 01 12-2013; Вучэбных планаў УВО № Е23-208/уч.; № Е 23-207/уч.; № Е 23-206/уч.; № Е 23з-218/уч.; Тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы» для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

**УКЛАДАЛЬНІК:**
Аляксандр Аляксандравіч Гужалоўскі, прафесар, д.и.н, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў

(пратакол № _9/2_ ад _28.05.2015__);

Вучэбна-метадычным саветам __БДУ____________________

(пратакол № __6_ ад __29.06.2015___)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы», прызначаная для асваення студэнтамі першай ступені вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца на 2 курсе па спецыяльнасці 1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) гістарычнага факультэта БДУ. Яе асаблівасцямі з'яўляюцца: акцэнтацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, узмацненне ролі і долі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных педагагічных тэхналогій.

Праграма распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

- «Палажэнне аб самастойнай працы студэнтаў (курсантаў, слухачоў)», зацверджанае міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 2015/04/06 г.;
- «Парадак распрацоўкі і зацвярджэння вучэбных праграм і праграм практыкі для рэалізацыі зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі», зацверджаны міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 2015/04/06 г.;
- «Інструкцыя па разліку працаёмкасці адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі з выкарыстаннем сістэмы заліковых адзінак», зацверджаная міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 2015/04/06 г.;
- Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.05. 2012 г. № 53 «Аб зацвярджэнні правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі».

У вучэбнай праграме ўлічаны патрабаванні Адукацыйнага стандарта «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)».

Дысцыпліна «Гісторыя музейнай справы», звязаная з навучальнымі дысцыплінамі, якія вывучаюць на 1–2 курсах. Вывучэнне гісторыі музейнай справы грунтуецца на вывучэнні «Тэорыі і гісторыі культуры», «Усеагульнай гісторыі мастацтваў». Вывучэнне гэтых дысцыплін фармуе ў студэнтаў уяўленне аб асноўных працэсах і заканамернасцях развіцця культуры, што дазваляе ў рамках вывучаемага курсу ў сваю чаргу сфармаваць уяўленне пра заканамернасці і асаблівасці развіцця музейнай справы на кожным з этапаў яе гісторыі.

Праграма звязана адзінай канцэпцыяй, прынцыпамі адбору і выкладання матэрыялу. У аснову праграмы пакладзена вывучэнне месца і ролі музея ў сістэме развіцця цывілізацыйных працэсаў. Праграма курса ахоплівае храналагічна і тэматычна шырокі матэрыял і разлічана на вывучэнне на працягу аднаго семестра.

Мэта дадзенага курса – даць будучым спецыялістам музейнай сферы неабходны запас музеялагічных ведаў, а таксама на прыкладзе зараджэння, станаўлення і дзейнасці вядучых айчынных і замежных музейных устаноў сфармаваць падмурак прафесійных ведаў.

Галоўнымі задачамі выкладання дысцыпліны з'яўляюцца:
- фарміраванне асобы студэнта як грамадзяніна, культурнага, талерантнага, з глыбокім разуменнем сутнасці музейных працэсаў;
- фарміраванне здольнасці крэатыўнага і крытычнага мыслення ў сацыяльна-вытворчай і прафесійнай дзейнасці, станаўленне сучаснага стылю навукова-практычнага мыслення;
- фарміраванне падмурка музеялагічных ведаў на аснове вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай гісторыка-філасаўскай думкі;

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта да кампетэнцый выпускніка па дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы», выпускнік павінен ***ведаць***:
- асноўныя этапы развіцця музейнай справы буйнейшых краін свету;
- гістарычны шлях, пройдзены музейнай справай Беларусі;
- асноўныя паняцці тэорыі і методыкі гісторыі музейнай справы;
- ролю музеяў у развіцці культуры чалавецтва.

***умець***:
- выкарыстоўваць асноўныя паняцці, законы і фактычны матэрыял па гісторыі музейнай справы ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;
- аналізаваць крыніцы па гісторыі музейнай справы Беларусі;
- даваць характарыстыку гісторыі музейных устаноў, фарміравання музейнага фонду буйнейшых краін свету;
- аналізаваць вопыт музейнага будаўніцтва ў асобных рэгіёнах і краінах;
- вызначаць месца і ролю музеяў Беларусі ў развіцці сусветнай культуры.

У адпаведнасці з навучальным планам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці 1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) дадзеная дысцыпліна выкладаецца на 2 курсе ў 4 (2) семестры на дзённай форме навучання.

Для вывучэння вучэбнай дысцыпліны на дзённай форме адводзіцца: агульная колькасць гадзін – 180, 4 заліковых адзінкі, колькасць аўдыторных гадзін – 84, з якіх 50 гадзін адводзіцца на правядзенне лекцый, 26 гадзін на практычныя (семінарскія) заняткі, 8 гадзін КСР. Па выніках вывучэння вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца здача экзамену.

## 1. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

# Модуль 1. Асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя паняцці, крыніцазнаўства і гістарыяграфія гісторыі музейнай справы і аховы помнікаў

Аб'ект і прадмет, метады навуковага даследвання гісторыі музейнай справы. Асноўныя катэгорыі. Этымалогія слова «музей». Дыферэнцыяцыя паняццяў «музейная справа», «музей». Уяўленне аб музеі як сацыекультурным інстытуце памяці. Значэнне гісторыі музейнай справы для гісторыі культуры, навукі, адукацыі. Сувязь курса гісторыі музейнай справы з курсамі айчыннай і сусветнай гісторыі, гістарычнага краязнаўства.

Крыніцы вывучэнння гісторыі музейнай справы. Пісьмовыя крыніцы. Арыгінальныя апісанні і каталогі музеяў. Музеязнаўчыя выданні: манаграфічныя даследванні, дапаможнікі, працы музеяў, музеязнаўчыя часопісы. Бібліяграфічныя паказальнікі і рэфератыўныя выданні па музейнай справе.

Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы. Першыя спробы разгляду этапаў развіцця музеяў: К. Найкель, І. Канальд. Агляд дзейнасці музеяў у працах першай паловы XIX ст.: К. Бецігер, Г. Клем. Асвятленне гісторыі развіцця асобных музеяў Расіі ў другой палове XIX ст.: «Агляд гісторыі музеяў Імператарской Акадэміі навук»; каталогі вайсковых музеяў. Першае абагульняючае даследванне па гісторыі музейнай справы. Д. Мэры і яго канцэпцыя аб залежнасці развіцця музеяў ад узроўню культуры грамадства. Вывучэнне гісторыі асобных музеяў краін Еўропы і Расіі. Даследванні В. Шэрэра па гісторыі нямецкіх мастацкіх музеяў, І. Шлосэра аб развіцці музейнай справы ў перыяд Рэнесансу, Ф. Шміта аб гісторыі развіцця музеяў Еуропы, Г. Маліцкага аб музеях Расіі. Працы па гісторыі прыватнага калекцыянерства твораў мастацтва Ф. Тэйлар, А. Уітлін. Праблемы гісторыі музеяў і пытанні рэфармавання музейнай справы ў другой палове XX ст. у даследваннях К. Шрайнера, Дж. Льюіса, А. Уітлін. Работы Э. Александэра аб дзейнасці буйных рэфарматараў музейнай справы на Захадзе і напрамках працы асобных груп музеяў. Дзейнасць сучасных расійскіх даследчыкаў па вывучэнню гісторыі музейнай справы і дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне. Працы А.М. Разгона, С.А. Каспарынскай, А.І. Фралова. Распрацоука праблем гісторыі музейнай справы на Беларусі: Б.Брэжга, Л.В. Аляксееў, Г.А. Каханоўскі.

# Модуль 2. Перыяд дамузейнага збіральніцтва

Збіральніцтва прадметаў музейнага значэння ў Старажытным свеце. Зборы эканамічнага значэння. Зборы сацыяльнага прэстыжу. Магічныя і іншыя рытуальныя зборы. Зборы як праяўленне групавой прыналежнасці.

Зборы як сродак стымулявання цікавасці да навакольнага свету. Зборы як сродак эмацыянальнага ўспрыяцця. Перадмузейныя зборы каштоўнасцей у перыяд старажытных цывілізацый. Скарбніцы ў храмах, бібліятэках у Старажытным Егіпце, Асірыі, Вавілоне. Бібліятэка Ашурбанапала.

Зборы мастацкіх твораў (скульптура, мастацкая кераміка) у Старажытнай Грэцыі. Храмы Афіны, Зеўса, Апалона, Дземетры, Дзіяніса як правобразы музеяў мастацтва. Пінакатэка на Акропалі ў Афінах (V ст. да н. э.). Гліптатэткі (сховішчы скульптур), гліпцікаты (сховішчы дробнай пластыкі). Урачыстыя агульнагрэчаскія святы.

Паяўленне калекцый камей, шкла, карцін, дываноў, статуй і іншых мастацкіх прадметаў у Старажытным Рыме. Галерэі Гая Верэса, Сулы. Калекцыя імператара Аўгуста. Паяўленне першых каталогаў і вопісаў калекцый. Александрыйскі Мусейён. Зборы Старажытнага свету і публіка.

Перадмузейныя зборы ў эпоху сярэдневечча: зборы эканамічнага характару ў рэзідэнцыях феадалаў, калекцыі магічнага характару прадметаў у храмах, рэлікварыі.

Старажытнабеларускае збіральніцтва. Княжацкія і манастырскія зборы старажытнасцей. Захаванне рэчаў у культавых мэтах і ў якасці сведкаў мінулага. Скарбніца вялікіх князей літоўскіх у Вільні.

## Модуль 3. Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Адраджэння

Гісторыка-культурныя перадумовы станаўлення культуры Адраджэння. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Еўропы: пераарыентацыя гандлевых шляхоў, развіццё рамestваў, гандлю. Эпоха геаграфічных адкрыццяў. Змены ўяўленняў аб свеце. Гуманізацыя культуры. Культ розуму і ведаў. Уздым цікавасці да мінулага, гістарычнага вопыту чалавецтва. Павышэнне цікавасці да сістэматычнага калекцыяніравання аб’ектаў прыроды.

Адраджэнне прыватнага збіральніцтва. Мастацкія калекцыі дынастыі Медзічы ў Фларэнцыі, Ганзага ў Мантуі, Монтэфельтра ва Урбіна. Мецэнацкая і калекцыянерская дзейнасць рымскіх пап у Рыме: Сікст IV, Юлій II, Леў X. Пачатак археалагічных раскопак у Рыме. Антыкварыюм Вітэльсбахаў у Мюнхене. Мастацкі збор дынастыі Габсбургаў. Кунсткамера ў замку Амбрас. Мастацкія зборы ў палацах Эскарыял і Алькасар. Мецэнацкая і калекцыянерская дзейнасць Францыска I Валуа. Т. Хэйворд і пачатак збіральніцтва і вывучэння артычнай спадчыны ў Англіі.

Вучоныя-калекцыянеры і збіральнікі-арыстакраты. Узнікненне сацыяльных функцый музея. Стварэнне калекцыянерамі таксанамічных схем: Ф. Кальчалары (Верона), М. Меркаці (Рым), Ф. Імперата (Неапаль). Стварэнне калекцый экзатычных мінералаў, раслін, жывёл. Анатамічныя музеі і тэатры. Дзяржаўныя скарбніцы: лонданскі Таўэр, Вавельскі замак у Кракаве, Збройная палата ў Маскве.

Узнікненне першых музеяў. «Галерэя», «студыёла», «гардароба», «кунсткамера», «мюнц-кабінет». Зараджэнне гістарычных, мастацкіх і прыродазнаўчых музеяў. Узнікненне музейнай тэрміналогіі. У. Альдравандзі, Дж. Вазары.

Прыватнае збіральніцтва на Беларусі. Узнікненне збора Радзівілаў у Нясвіжскім замку. Зборы Сапегаў, Астрожскіх, Прозараў.

## Модуль 4. Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы

Палітыка "асветнага абсалютызму" і яго ўплыў на культурныя працэсы. Абсалютызацыя ролі навукі. Новыя класіфікацыі ведаў. Панаванне рацыяналізму і універсалізму. Значэнне навуковых таварыстваў і універсітэтаў у культурным жыцці эпохі.

Першыя спробы групавання прадметаў музейнага значэння ў калекцыях і музеях. Фарміраванне ўяўленняў аб музейных экспанатах як базе для асветы і навуковых даследаванняў. Змены сацыяльных функцый збіральніцтва і сацыяльнага складу збіральнікаў. Універсальны характар прыватных збораў. Палацавыя калекцыі жывапісу: Луўр (Парыж), Цвінгер (Дрэздэн), Імператарская галерэя (Вена), галерэя Квірынальскага палаца ў Рыме.

Нараджэнне Эрмітажа як збору заходне-еўрапейскага жывапісу (1764). Новы тып музея, заснаванага на закупках твораў мастацтва. Роля Эрмітажа у развіцці рускай мастацкай культуры. Калекцыі Я. Бруса, Д. Галіцына, П. Мусіна-Пушкіна, Н. Юсупава. Найбольш распаўсюджаныя тыпы музейных збораў у Еўропе: кунсткамеры, пінакатэкі, арсеналы, цэйхгаузы, рэлікварыі, скарбніцы (сховішчы нацыянальных рэліквій), мюнц-кабінеты (калекцыі манет і медалёў).

Адкрыцце першых публічных прыродазнаўчых музеяў у Еўропе: Кунсткамера ў Пецярбургу (1719), Брытанскі музей у Лондане (1753). Дзейнасць Пятра І па стварэнню музейных калекцый. Адкрыццё першага публічнага музея ў Прыбалтыцы (Рыга, 1773). Стварэнне першага музея на амерыканскім кантыненце (1773).

Узнікненне мастацкіх выставак. «Салоны» Дзідро. Музеі навуковых таварыстваў і іх музеяў. Роля энцыклапедыстаў у развіцці музейнай справы. Адкрыццё для публічнага агляду Луўра (1793). Новыя формы музейнай прэзентацыі (панарамы, паноптыкумы). Абмежаванасць для наведвання шырокамі коламі насельніцтва першых публічных музеяў,

Ідэалогія Асветы і развіццё прыватнага збіральніцтва на Беларусі. Музеі вучэбных установ на беларускіх землях у другой пал. XVIII ст.: мэты, задачы, лёс. Музеі Полацкага езуіцкага калегіўма, Гродзенскай медыцынскай школы, Віленскага універсітэта. Элементы вайсковых калекцый у магнацкіх зборах (Нясвіж, Дзярэчын і інш.). Новыя тэндэнцыі

ў прыватным збіральніцтве. Мастацкія галерэі і прыродазнаўчыя зборы І. Храптовіча, А. Тызенгауза. Калекцыя Г. Ябланоўскай у Семяцічах. Роля збіральнікаў Беларусі ў развіцці мастацтва, прыродазнаўства, дакладных навук.

## Модуль 5. Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы ў першай палове XIX ст.

Асноўныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары развіцця музеяў у першай палове XIX ст. Рамантызм як мастацкі напрамак і агульнакультурны рух, яго ўплыў на фарміраванне новага светапогляду. Ідэя ўніверсалізму чалавечай прыроды і гісторыі.

Дэмакратызацыя публічных музеяў пад уплывам ідэй буржуазных рэвалюцый канца XVIII ст. Стварэнне нацыянальных музеяў. Музей Прада ў Мадрыдзе (1819). Адкрыццё Лонданскай нацыянальнай галерэі (1824). Старая Пінакатэка ў Мюнхене (1836). Узнікненне ваенна-гістарычных музеяў. Бурлівы росквіт мастацтвазнаўства. Адкрыцце новых мастацкіх музеяў. «Залаты век» музеяў мастацкага профілю. «Музей Напалеона» і яго уплыу на развіцце музейнай справы.

Новыя формы папулярызацыі ведаў пра грамадства і прыроду: панарамы, Амерыканскі музей Ф. Барнума, паноптыкум мадам Цюсо. З'яўленне навуковых метадаў паказу экспанатаў у музеях. «Акадэмічны рад» (Gallerea progressiva). Адыход ад выключнай зацікаўленасці ў антычнай спадчыне. З'яўленне зацікаўленасці да мясцовай даўніны. К. Томсэн і Музей паўночных старажытнасцей у Капенгагене (1819). Узнікненне руху за ахову і рэстаўрацыю нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Геаграфічнае пашырэнне музейнай дзейнасці – першыя публічныя музеі ў Капштаце (1795), Калькуце (1814), Рыа-дэ-Жарэйра (1815), Буэнас-Айрэсе (1823), Бухарэсце (1830), Квебеку (1836), Гаване (1847).

Рэарганізацыя Эрмітажа і Збройнай палаты. Уплыў перадавога грамадска-палітычнага руху на стварэнне новых музеяў і распрацоўку праектаў заснавання нацыянальных музеяў. Праекты Ф. Адэлунга, З. Валконскай, Т. Зана. «Рускі музеўм Паўла Пятровіча Свіньіна». Дзейнасць мецэнатаў і навуковых таварыстваў. Навуковыя экспедыцыі і стварэнне этнаграфічных музеяў і калекцый. І. Крузэнштэрн, Ф. Літке, Н. Пржэвальскі, М. Міклуха-Маклай і іх роля ў стварэнні музейных калекцый. Навуковыя экспедыцыі ў Егіпет, на Блізкі Усход, у Грэцыю. Узрост нацыянальнай свядомасці ва ўскраінных дзяржавах Еўропы і яго ўплыў на адкрыццё музеяў.

Росквіт прыватных калекцый на Беларусі. Узнікненне крыніцазнаўчага і мастацтвазнаўчага падыходаў у збіральніцтве. Я. і К. Тышкевічы, А. Плятэр, А. Праздэцкі. Роля прыватнага збіральніцтва на

Беларусі ва ўмовах адсутнасці агульнадаступных музеяў. Калекцыі М. Румянцава ў Гомельскім палацы, І. Сабольшчыкава ў Віцебску, «кабінет» М. Гаўсмана ў Мінску. Стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчага музея ў Гора-Горацкім земляробчым інстытуце.

## Модуль 6. Пашырэнне музейнай сеткі і спецыялізацыя музеяў у другой пал. XIX – пачатку XX ст.

Уплыў навуковых адкрыццяў, развіцця гандлю, вытворчасці, транспарту на музейную справу. Павялічэнне колькасці спецыялізаваных музеяў: мастацкіх, прыродазнаўчых, навукова-тэхнічных, гістарычных. Тэхнічная рэвалюцыя. Стварэнне першых прамысловых музеяў. Лонданская сусветная выстаўка (1851) і яе роля ў развіцці музейнай справы: Южна-Кенсінгтонскі музей у Лондане(1852), Аўстрыйскі мастацка-прамысловы музей у Вене (1864), Нямецкі музей раместваў у Мюнхене (1903). Лекторыі і тэматычныя экскурсіі.

Шпаркае павялічэнне калекцый «старых» музеяў і пераўтварэнне іх ва ўстановы энцыклапедычнага характару (Луўр, Брытанскі музей, Эрмітаж). Буйнейшыя новыя музейныя праекты (Востраў музеяў у Берліне, Палац прыроды і Палац мастацтваў у Вене, музей «Метраполітэн» у Нью-Ёрку, Смітсанаўскі інстытут у Вашынгтоне, галерэя «Тэйт» у Лондане). Фарміраванне спецыяльных гістарычных дысцыплін і ўзнікненне новых спецыялізаваных музеяў гістарычнага профілю. Навуковыя гістарычныя таварыствы і іх ўплыў на дзейнасць музеяў.

Пачатак рэгіянальнага краязнаўчага руху і масавае ўзнікненне музеяў мясцовага краю. Іх сувязь з нацыянальнымі рухамі у шматнацыянальных імперскіх дзяржавах. Рост цікавасці да мясцовай гісторыі.

Росквіт музейнай дзейнасці ў Расійскай імперыі на пачатку XX ст. Таварыства перасоўных выставак. Роля дзяржаўных ініцыятыў, а тасама мецэнатаў і калекцыянераў у пашырэнні музейнай сеткі краіны. Дзяржаўны гістарычны музей, галерэя братоў Траццяковых, музей прыгожых мастацтваў І. Цвятаева, Палітэхнічны музей у Маскве. Рускі музей імя Аляксандра III, мастацка-прамысловы музей у Пецябурзе. Узнікненне першых літаратурна-мемарыяльных музеяў.

Фарміраванне сучаснай структуры музейных установ. Падзел фондаў і экспазіцый. Новыя экспазіцыйныя рашэнні. Скансэны, мемарыялы, батальныя панарамы. Спецыялізацыя музейнай прафесіі. Адасабленне захоўвання, рэстаўрацыі, папулярызацыі калекцый у самастойныя напрамкі прафесійнай дзейнасці. Фарміраванне музейнай грамадскасці. Музеязнаўчыя з'езды і выданні.

Уздым музейнага руху на Беларусі. Узнікненне Віленскага музея старажытнасцей і яго роля ў захаванні і папулярызацыі нацыянальнай гістарыка-культурнай спадчыны. Роля беларускай інтэлігенцыі ў стварэнні музея ў Вільні. Стварэнне на беларускіх землях музеяў і выставак

эканоміка-тэхнічнага профілю. Прамысловыя выстаўкі, музеі пры палатах дзяржаўных маемасцей, статыстычных камітэтах.

Асноўныя фактары павялічэння колькасці музеяў у Беларусі на пачатку ХХ ст. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, уздым нацыянальнага руху. Дзейнасць навуковых і царкоўна-археалагічных таварыстваў, архіўных камісій, земстваў, вучэбных устаноў па стварэнні музеяў. Першыя профільныя і галіновыя музеі. Роля інтэлігенцыі ў развіцці музейнай справы. Дзейнасць Е.Р. Раманава. Выставачная дзейнасць Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Павышэнне якаснага і колькаснага паказчыкаў у прыватным збіральніцтве канца ХІХ – пачатку ХХ ст.: І. Луцкевіч, В. Федаровіч, І. Каладзееў, Э. Гуттэн-Чапскі, А. Ельскі, Г. Татур. Музейная сетка Беларусі напярэдадні І сусветнай вайны. Падзеі вайны і лёс беларускіх музеяў. Кансервацыя і эвакуацыя калекцый. Страта часткі музейнага фонду.

## Модуль 7. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы паміж двумя сусветнымі войнамі

Асаблівасці развіцця музейнай справы ў ліберальна-дэмакратычных краінах Заходняй Еўропы і ў ЗША. Шпаркае павялічэнне колькасці музейных устаноў розных профіляў. Наладжванне міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках Лігі нацый. Пашырэнне выдання музейнай літаратуры і перыядычных выданняў. Развіцце мастацкіх музеяў. Пашырэнне сеткі музеяў прыкладнога і сучаснага мастацтва. Нацыянальны Музей сучаснага мастацтва у Парыжы (1937). Этнаграфічныя музеі. Музей чалавека ў Парыжы і яго роля ў распаўсюджванні ідэй гуманізма, агульначалавечых каштоўнасцей. Буйнейшыя музейныя праекты, рэалізаваныя ў ЗША: Музей сучаснага мастацтва ў Нью-Ёрку (1929), «Грынфілд Вілідж» (1929), «Каланіяльны Ўільямсбург» (1934), Музей Гугенгейма ў Нью-Ёрку (1939), Нацыянальная галерэя ў Вашынгтоне (1941). Навукова-тэхнічныя і гістарычныя музеі.

Асаблівасці развіцця музеяў у таталітарных і аўтарытарных краінах (Італія, Германія, Японія). Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы. Падпарадкаванасць музейнай справы ідэалагічным устаноўкам. Музей Рымскай імперыі (1926), музей Мусаліні (1938) у Рыме. Дзейнасць музеяў мясцовага краю нацысцкай Германіі па выхаванню «сапраўдных немцаў». Перабудова дзейнасці нямецкіх ваенна-гістарычных музеяў. Масавае знішчэнне твораў «яўрэйска-бальшавіцкага мастацтва». Рэпрэсіі супраць прагрэсіўных музейных супрацоўнікаў.

Першыя законадаўчыя акты савецкага ўрада ў галіне музейнай справы. Нацыяналізацыя, улік, рэгістрацыя культурных і навуковых каштоўнасцей. Стварэнне дзяржаўных органаў кіравання музеямі. Усерасійская калегія па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва і даўніны. Стварэнне дзяржаўнага музейнага фонду, музейнай сеткі,

музейных установ новых профіляў. Пралетарскія музеі, музеі-ансамблі, гісторыка-рэвалюцыйныя і мемарыяльныя музеі. Удзел грамадскасці ў музейным будаўніцтве.

Роля музеяў у вывучэнні гістарычнага мінулага і прыроды Беларусі. Заканадаўчая база і арганізацыйнае кіраўніцтва музейнай дзейнасцю ў БССР. Беларускі дзяржаўны музей (1923) і яго аддзяленні. Музеі і краязнаўчы рух. Ведамасныя музеі ў БССР. Першы Усерасійскі музейны з'езд (1930) і яго ўздзеянне на развіцце музейнай справы ў СССР. Нарада музейных супрацоўнікаў БССР (1932). Звядзенне задач музейнай дзейнасці да задач палітасветы. Ператварэнне экспазіцый у ілюстратыўны ідэалагічны матэрыял. Барацьба з «рэчавым фетышызмам». Усеахапляючая ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы. Пагаршэнне навукова-даследчай, збіральніцкай і фондавай працы. Продаж каштоўнейшых музейных рэчаў за мяжу, фізічнае знішчэнне помнікаў культуры. Рэпрэсіі ў адносінах да музейных працаўнікоў, краязнаўцаў. Стварэнне (1921) і развіццё Беларускага музея імя І. Луцкевіча у Вільні. Гісторыка-археалагічны (1922) і Прыродазнаўчы (1926) музеі ў Гродне. Краязнаўчыя і мемарыяльныя музеі ў Заходняй Беларусі.

## Модуль 8. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў другой пал. XX ст.

Асноўныя накірункі развіцця музейнай справы ў ліберальна-дэмакратычных краінах пасля Другой сусветнай вайны. Лёс культурных каштоўнасцей, вывезеных гітлераўцамі з заваяваных краін. Міжнародна-прававыя нормы аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Уплыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і павелічэння вольнага часу на рост значэння музеяў у агульнай культуры чалавецтва. Павелічэнне колькасці музеяў у свеце. Удзел міжнародных арганізацый у дзейнасці музеяў розных краін. Роля UNESCO ў ахове культурных каштоўнасцей, у культурным супрацоўніцтве. Стварэнне Міжнароднага савета музеяў (1946), яго структура, мэты, рэгіянальныя арганізацыі. Міжнародны цэнтр па даследванню пытанняў аховы і аднаўлення культурных каштоунасцей (Рымскі цэнтр). Міжнародныя музейныя праекты. Алімпійскі музей ў Лазане (1982). Музеязнаўчая літаратура і перыёдыка. Міжнародны часопіс «Museum». Асаблівасці развіцця музейнай справы у розных рэгіёнах свету, у краінах з традыцыйнымі накірункамі музейнай практыкі і ў маладых краінах, якія сталі на шлях самастойнага развіцця. Буйнейшыя музейныя праекты: Нацыянальны антрапалагічны музей у Мехіка (1964), Нацыянальны музей паветраплавання і касманаўтыкі ў Вашынгтоне (1976), Горад навукі і тэхнікі ў Парыжы (1986), Музей навукі і тэхнікі на Тайвані (1986), Музей цывілізацыі ў Квебеку (1988). Новыя формы работы

музейных устаноў. Тэндэнцыя канцэптуалізацыі музейнай дзейнасці. Пашырэнне сферы музеефікацыі: Актыўны музей фашызма і супраціву ў Берліне, карабель-музей «Ваза» у Стакгольме, «вестыбюльныя» экспазіцыі ў карпаратыўных будынках. Адраджэнне цікавасці да этнічных каранёў. Экамузеі і новая музеялогія. Асаблівасці фарміравання і развіцця музеялогіі як навуковай дысцыпліны, стварэнне сеткі музейных даследчых і вучэбных цэнтраў у свеце. Музейная педагогіка і сацыялогія. Рацыяналізацыя музейнай дзейнасці, узнікненне музейнага маркецінга і менеджмента. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій ва ўліковай і адукацыйна-асветніцкай дзейнасці. Музей і Інтэрнэт.

Асноўныя накірункі развіцця музейнай справы ў сацыялістычных краінах. Абнаўленне і вяртанне да жыцця музеяў СССР і краін усходняй Еўропы ва ўмовах пасляваенных цяжкасцей. Арганізацыйная структура і сістэма кіраўніцтва музейнай справай. Краязнаўчы музей – асноўны тып савецкай музейнай установы. Адраджэнне фундаментальных асноў ў музейнай справе СССР у другой палове 1950-х гг. Тэндэнцыі дэмакратызацыі жыцця краіны і іх уплыў на развіцце музеяў. Узмацненне захавальніцкай і навукова-даследчай працы пры захоўванні погляду на музей як на культурна-асветніцкую ўстанову. Фарміраванне сучаснай структуры музейнай сеткі: музеі падпарадкавання Міністэрства культуры, музеі ведамстваў і ўстаноў, грамадскія музеі. Размеркаванне музейных устаноў на тэрыторыі СССР. Пашырэнне музейнай сеткі. Стварэнне музеяў-запаведнікаў. Пастанова СМ СССР «Аб музейным фондзе Саюза ССР» (1965). Закон «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1976). Стварэнне ў 1980-я гг. цэнтралізаваных музейных сістэм, музейных аб'яднанняў. Асаблівасці арганізацыі і развіцця музейнай справы ў асобных сацыялістычных краінах.

Характарыстыка асноўных накірункаў дзейнасці беларускіх музеяў у другой палове XX ст. Страты музеяў БССР падчас Вялікай Айчыннай вайны. Узнаўленне і развіцце органаў кіраўніцтва музейнай справай, музейнай сеткі рэспублікі. Заканадаўчая база музейнай дзейнасці. Стварэнне Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (1943), Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы (1944), Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея (1948), аднаўленне Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, Дома-музея А. Міцкевіча, Дома-музея I з’езда РСДРП, абласных і раённых краязнаўчых музеяў. Палітыка рэгламентацыі і стандартызацыі дзейнасці музеяў. Роля і месца ваенна-патрыятычнай тэматыцы ў камплектаванні музейных калекцый і іх выкарыстанні ў адукацыйна-асветніцкіх мэтах. Адкрыццё Музея абароны Брэсцкай крэпасці (1956). Мемарыяльныя музеі. Агульны працэс дэмакратызацыі жыцця краіны, узрастанне ўвагі да пытанняў аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і прыроды. Турыстычны рух. Дзяржаўны музей БССР (1964) – галоўны цэнтр па вывучэнні рухомай гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны рэспублікі. Дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі і атэізму (1973), Беларускі дзяржаўны музей народнага дойлідства і побыту

(1976), Музей старажытнабеларускай культуры АН БССР (1977), Веткаўскі раённы краязнаўчы музей (1978), Браслаўскі раённы краязнаўчы музей (1984), Аб’яднанне літаратурных музеяў БССР (1987), Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (1990). Філіялізацыя музейных устаноў. Музеі-запаведнікі. Буйнейшыя ведамасныя музеі. Грамадскія музеі. Музейны фонд Беларусі. Умовы захавання, уліку, вывучэння і прэзентацыі музейных калекцый. Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь ва ўмовах суверэннай дзяржавы. Рэстытуцыя гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пераацэнка сацыяльных функцый музеяў. Характарыстыка сучаснага становішча музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь. Перспектывы яе развіцця.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЛЯ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

| Нумар раздзела, темы, занятия | Назва раздзела, тэмы, занятка | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Кірауемая самастойная праца студэнта | Формы кантролю Ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | практические (семінарскія) Заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 9 |
| 1.1 | **Асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя паняцці, крыніцазнаўства і гістарыяграфія гісторыі музейнай справы і аховы помнікаў.** | 6 | 2 | -- | - | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 2. | **Перыяд дамузейнага збіральніцтва.** | 4 | 2 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 3. | **Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Адраджэння.** | 4 | 2 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 4. | **Фармаванне як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы.** | 6 | 4 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1.5 | **Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы у першай палове XIX ст.** | 6 | 4 | – | 2 | Экспрэс-апытанне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. 6. | **Пашырэнне музейнай сеткі і спецыялізацыя музеяў у другой палове XIX - пачатку XX стст.** | 6 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1.7. | **Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы паміж двума сусветнымі войнамі.** | 10 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 8. | **Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў другой палове XX в.** | 10 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| **Разам:** | | **52** | **32** | | **8** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

| №№ п/п | Спіс літаратуры | Год выдання |
|---|---|---|
| | **Асноўная** | |
| 1. | Алексеев Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в. Мн. | 1996 |
| 2. | Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць. Мн., БелІПК. | 1998 |
| 3. | Бярэйшык Л.У., Гужалоўскі А.А. Музеі замежных краін. Мн. | 2004 |
| 4. | Грицкевич В. П. История музейного дела до конца XVIII века: В 2 ч. Спб. | 2001 |
| 5. | Грицкевич В. П., Гужаловский А.А. История музеев мира. Мн. | 2003 |
| 6. | Гужалоўскі А. А. Музеі Беларусі. 1918 - 1941. Мн. | 2002 |
| 7. | Гужалоўскі А. А. Музеі Беларусі. 1941 - 1991. Мн. | 2004 |
| 8. | Гужалоўскі А. А. Нараджэнне беларускага музея. Мн. | 2001 |
| 9. | Гужалоўскі А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі. Мн. | 2012 |
| | **Дадатковая** | |
| 10. | Боханов А Н. Коллекционеры и меценаты России. М. | 1987 |
| 11. | Лысикова О. В. Музеи мира. М. | 2002 |
| 12. | Музееведческая мысль в России XVIII–XX вв. : сб. документов и материалов / отв. ред. Э.А.Шулепова. М. | 2010 |
| 13. | Очерки истории музейного дела в России. М., Вып. 2; Вып. 3; Вып. 5; Вып. 6; Вып. 7. | 1960; 1961; 1963; 1968; 1971 |
| 14. | Фролов А. И. Основатели российских музеев. М. | 1991 |
| 15 | Юренева Т. Ю. Музеи мира: история и коллекции, шедевры и раритеты. М. | 2011 |
| 16. | 100 великих музеев мира. Авт.- сост. Н.А. Ионина. М. | 1999 |
| 17. | Alexander E. Museum Masters. Nashville. | 1983 |
| 18. | Murrey D. Museums, Their History and Their Use. Glasgow. Vol. 1-3. | 1904 |
| 19. | Wittlin A. The Museums. Its History and its Tasks in Education. L. | 1949 |

| | | |
|---|---|---|

# 2. КІРУЕМАЯ САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ: ЗАДАННІ, КРЫТЭРЫІ РАБОТЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ.

## *2.1. Прыкладны  пералік заданняў КСР.*

У якасці КСР студэнты 2 курса павінны напісаць кантрольную работу па тэме «Гісторыя музеяў Беларусі» па кнізе А.А. Гужалоўскага «Нараджэнне беларускага музея» і прайсці тэставанне на веданне фактычнага матэрыялу ў рамках курса. У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, рэкамендуемых да выкарыстання ў ходзе выкладання дысцыпліны, варта вылучыць: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці, праектныя тэхналогіі, камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады) і інш.

## *2.2. Пералік выкарыстоўваемых сродкаў дыягностыкі.*

Форма і працэдура дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў распрацаваны ў адпаведнасць з Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.05. 2012 г. № 53 «Аб зацвярджэнні правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі» і Адукацыйным стандартам «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльность 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)» ОСВО 1-23 01 12-2013.

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя сродкі: праблемныя тэсты, прамежкавы залік, аналіз гісторыка-музейных з’яў, складанне сінхранічных табліц і іншыя сродкі дыягностыкі.

## *2.3. Патрабаванні да кантрольнай работы.*

Кантрольная работа па дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы» выконваецца студэнтамі, якія спецыялізуюцца на кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. Змест кантрольнай работы складаецца з наступных раздзелаў: увядзенне (з характарыстыкай асноўнай літаратуры па дадзенай тэме), асноўная частка, якая складаецца з некалькіх раздзелаў, у якіх раскрываюцца тэмы паводле пытанняў (раздзелы вызначаюцца студэнтам самастойна і абмяркоўваюцца з выкладчыкам на

індывідуальных кансультацыях), заключэнне, у якім рэзюміруецца асноўныя высновы па выкладзенай тэме і спіс літаратуры.

Абарона кантрольнай работы ажыццяўляецца ў індывідуальным парадку на індывідуальных кансультацыях у вуснай форме. Студэнт павінен добра ведаць змест сваёй працы, умець адказваць на пытанні па абранай тэме, аргументавана выказваць свой пункт гледжання.

### *2.4. Крытэрыі работы па рэйтынгавай сістэме для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі.*

Вывучаемы курс падзяляецца на тэматычныя модулі. У рамках кожнага модуля чытаюцца лекцыі, праводзяцца семінарскія заняткі, выконваюцца заданні па КСР (у адпаведнасці з тыпавой і вучэбнай праграмамі).

У якасці КСР па модулю 1 студэнтам неабходна здаць прамежкавы залік у выглядзе тэставання, па модулях 2-6 – сінхранічную табліцу і крыніцазнаўчы агляд, па модулях 5-6 выканаць кантрольную працу.

На працягу семестра ў адпаведнасці з раскладам кансультацый праводзяцца індывідуальныя кансультацыі для студэнтаў па вывучаемай дысцыпліне ў адпаведнасці з графікам кансультацый выкладчыка.

Па выніках працы студэнтаў на працягу модуля (праца на лекцыях, семінарскіх занятках, праходжанне тэставання, здача прамежкавага заліку і інш.) падводзіцца вынік (вызначаецца рэйтынг студэнта па модулю або рэйтынгавая модульная ацэнка). Рэйтынг студэнта па модулю вызначаецца як сярэдняя адзнака па 10-бальнай сістэме за ўсе віды працы на працягу модуля.

Калі студэнт зарабіў ацэнку 7 і вышэй (пры гэтым ацэнка за выніковае тэставанне або прамежкавы залік не менш як 7), то дадзены модуль залічваецца аўтаматычна і яго ўжо студэнт не здае падчас семестравага іспыту. Такім чынам будуецца работа па кожнаму модулю. У выніку сярэдняя адзнака за ўсе модулі складае рэйтынгавую ацэнку студэнта за бягучую працу ў семестры.

Білет на экзамене ўключае ў сябе два пытанні. Экзаменацыйная адзнака складаецца як сярэдняя з улікам адзнак па пытаннях ўсіх модуляў. Выніковая рэйтынгавая адзнака па дысцыпліне, якая выстаўляецца ў заліковую кніжку студэнта, складаецца з рэйтынгавай ацэнкі за бягучую працу на працягу семестра + заліковая адзнака ў наступнай прапорцыі: вагавы каэфіцыент бягучай паспяховасці 50% (0,5) і вагавы каэфіцыент заліковай ацэнкі 50% (0,5).

Студэнты на першым занятку па дысцыпліне знаёмяцца з умовамі модульна-рэйтынгавай сістэмы, якія не змяняюцца на працягу семестра.

## *2.5. Тэмы кантрольных работ.*

Па дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы» студэнтам рэкамендуюцца наступныя тэмы кантрольных работ:

- Прыватныя зборы эпохі Адраджэння.
- Прыватнае калекцыянаванне эпохі Асветы.
- Першыя музеі эпохі Асветы.
- Прыватнае калекцыяніраванне ў першай палове XIX ст.
- Прыватнае калекцыяніраванне ў другой палове XIX – пачатку XX стст.
- Першыя музеі Беларусі эпохі Асветы.
- Віленскі музей старажытнасцяў.
- Музеі навучальных устаноў Беларусі.
- Царкоўна-археалагічныя музеі.
- Музеі навуковых таварыстваў.
- Беларускі дзяржаўны музей і яго аддзялення ў 1920-я гг.
- Музеі і краязнаўства.
- Музеі Заходняй Беларусі.
- Музеі Беларусі ў сярэдзіне 1950-х – канцы 1960-х гг.
- Аднаўленне музейнай сеткі Беларусі ў пасляваенны дзесяцігоддзе.
- Музеі Беларусі ў 1970-я – 1980-я гг.
- Развіццё дзяржаўнай музейнай сеткі Беларусі ў 1950-1980-я гг.
- Ведамасныя музеі Беларусі.
- грамадскія музеі Беларусі.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Тэорыя і гісторыя культуры | Этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў | Не | Зацьвердзіць дадзеную рэкамендацыю (28.05.2015 г., № 9/2) |

# ДАДАТКІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Дадаткі і змены | Падмурак |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і ўхвалена на пасяджэнні кафедры
(пратакол № ад )

Загадчык кафедрай

этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
д. гіст.навук, доцент _____________ Т.А. Навагродскі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан гістарычнага факультэта
д. гіст. навук, прафесар __________________ А.Г. Каханоўскі